# Восень шыла сарафан

*Міхась Даніленка*

Задумала Восень сабе абнову пашыць... I перш за ўсё выбрала залацістыя і чырванаватыя колеры: яны ёй больш да твару. Ціха хадзіла палямі, пералескамі і падбірала сабе на сарафан то трохі чырвані, то залацінак, што свяціліся ў лістоце дрэў. I асіны, і грушы ажно чырванелі ў праменнях ціхага сонца, а клёны і бярозы залаціліся сваімі кронамі на ўзлессі.

«Добра было б пацеркі падабраць», — падумала Восень і ўбачыла рабіну. Гронкі яе наліліся чырванню, цяжка звісалі долу. Чым не пацеркі?

А потым Восень яшчэ збірала дробненькія сінюткія кветачкі верасу, сціплых бяссмертнікаў. А ў кужэльную [1] касу сваю ўпляла трапяткія белыя павуцінкі...

— Цяпер, здаецца, усё, — сказала Восень і паглядзела ў круглае люстэрка — шырокае азярцо.

[1] *Кужэ́льны* — ільняны.